супрацоўніцтва

# Папулярызацыя набыткаў



**Цырымонія перадачы кніг пра Бацькаўшчыну беларускай дыяспары ў Турэцкай Рэспубліцы і найстарэйшаму ў краіне Стамбульскаму ўніверсітэту адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Мерапрыемства было прымеркавана да 100-годдзя галоўнай кніжніцы краіны. Сімвалічна, што колькасць падараваных кніг складала сто, сярод якіх пераважалі дзіцячыя выданні, падручнікі роднай мовы і літаратуры для розных класаў агульнаадукацыйнай школы, беларуска-рускія і руска-беларускія слоўнікі, часопісы аб Беларусі, паштоўкі з акварэлямі беларускіх мастакоў, зборнікі паэзіі айчынных аўтараў, а таксама турыстычныя і краязнаўчыя альбомы аб Беларусі.

Беларускую дыяспару ў Турцыі прадстаўляў на ўрачыстасці генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Стамбуле Аляксей Швед. У коле зацікаўленай грамадскасці, прадстаўнікоў СМІ і супрацоўнікаў бібліятэкі кнігі ўручыў яму намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Віктар Пшыбытка.

Рэктар Стамбульскага ўніверсітэта прафесар Махмут Ак павіншаваў ад імя навучальнай установы галоўную кніжніцу краіны з юбілеем, пажадаў росквіту і падзякаваў за супрацоўніцтва. Каштоўным падарункам бібліятэцы ад Стамбульскага ўніверсітэта сталі факсімільныя выданні «*Muhibbi Divani*», «*Swordsman, Historian, Mathematician, Artist, Calligrapher — Matrakci Nasuh and His Menazilname*» эпохі Сулеймана І Цудоўнага — аднаго з наймагутнейшых султанаў, у перыяд кіравання якога Асманская імперыя перажывала неверагодны ўздым.

Падзея перадачы выданняў стала адным з істотных крокаў на шляху ўмацавання міжнародных сувязяў, падтрымкі суайчыннікаў, распаўсюджання інфармацыі аб краіне і папулярызацыі яе нацыянальных традыцый і духоўных набыткаў.

**Мая РЫСЬ**

**Фота з сайта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**